ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 13 (1087) ● Чацвер, 10 красавіка 1975 г. ● Газета выходзіць з 1935 г. ● Цана 2 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

● З ПАРТЫЙНЫХ СХОДАЎ ● СТАРОНКА НАРОДНАГА КАНТРОЛЮ ● ДА 30-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ ● НА ЛІТАРАТУРНЫ КОНКУРС ● СПОРТ

## У РЭКТАРАЦЕ

**На пасяджэнні рэктарата падведзены вынікі вытворчай і педагагічнай практык за 1974 год і намечаны меры па іх удасканаленню.**

**Са справаздачай аб выніках вытворчай практыкі выступіў У. Д. Мухаеў. Ён дэталёва прааналізаваў дасягненні і недахопы ў арганізацыі вытворчай практыкі ва універсітэце і намеціў меры па яе паляпшэнню.**

**Загадчыца педагагічнай практыкі В. М. Яйсо далажыла рэктарату аб правядзенні педагагічнай практыкі ў мінулым годзе.**

**Аб рабоце штаба працоўных спраў па падрыхтоўцы да летняга працоўнага семестра на пасяджэнні рэктарата паведаміў сакратар камітэта камсамола БДУ У. Навумовіч.**

**Ён далажыў рэктарату, што камплектаванне будаўнічых атрадаў ва універсітэце ідзе паспяхова. Амаль на ўсіх факультэтах план камплектавання выкананы на 95 працэнтаў.**

## ЮРФАК—ДА ВЫБАРАЎ

У канцы сакавіка на юрыдычным факультэце адбыўся партыйны сход, на якім разглядалася пытанне «Аб задачах партарганізацыі юрфака ў сувязі з падрыхтоўкай і правядзеннем выбараў у Вярхоўны Савет БССР, у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Саветы дэпутатаў працоўных рэспублікі».

З інфармацыяй на сходзе выступіў сакратар партарганізацыі юрфака А. А. Галаўко. Камуністы з задавальненнем успрынялі рашэнне парткома універсітэта аб назначэнні партарганізацыі юрыдычнага факультэта галаўной у падрыхтоўцы і правядзенні выбараў 15 чэрвеня 1975 года.

З мэтай найлепшай арганізацыі выбарчай кампаніі партсход пастанавіў лічыць сваёй асноўнай задачай праводзенне ў жыццё выбарчага заканадаўства, растлумачэнне выбаршчыкам палітыкі Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада, Звароту ЦК КПСС да партыі, да савецкага народа, пастановы ЦК КПСС аб 30-годдзі Перамогі над фашысцкай Германіяй.

Партсход прапанаваў загадчыкам кафедр выдзеліць выкладчыкаў для арганізацыі юрыдычных кансультацый на агітпунктах, правесці дэталёвую кансультацыю-інструктаж з агіткалектывам выбарчага ўчастка.

Партсход абавязаў выкладчыкаў кафедры дзяржаўнага права і савецкага будаўніцтва актыўна ўключыцца ў выбарчую кампанію, выступіць з дакладамі перад прапагандыстамі горада і рэспублікі аб сутнасці дэмакратычных прынцыпаў савецкай выбарчай сістэмы, аб дэмакратызме Саветаў дэпутатаў працоўных.

Было прапанавана выкладчыкам факультэта і студэнтам-лектарам выступіць па радыё, тэлебачанню і ў друку з матэрыяламі аб дэмакратызме савецкай выбарчай сістэмы і эфектыўнасці работы Саветаў нашай рэспублікі.

Камітэту камсамола юрфака партсход рэкамендаваў звярнуць увагу на правядзенне шырокай растлумачальнай работы сярод студэнтаў і актыўнае ўцягненне камсамольцаў у выбарчую кампанію.

Э. КАЛІНІНА.

## УВАГА ІНТЭРНАТУ

На партыйным сходзе хімічнага факультэта было разгледжана пытанне «Аб рабоце студсавета інтэрната № 6».

З дакладам на сходзе выступіў старшыня студэнцкага савета інтэрната № 6 В. Дзенісенка.

Абмеркаваўшы даклад, партыйны сход адзначыў, што работа студсавета праводзілася актыўна і планамерна, і гэта ў значнай ступені садзейнічала паляпшэнню ўмоў жыцця студэнтаў.

Рэгулярна праводзіліся мерапрыемствы па палітыка - выхаваўчай, культурна-масавай, жыллёва - бытавой, санітарнай і іншых відах работ. Забяспечана нармальная работа радыёвузла, рэгулярна выходзіць насценгазета, палепшаны санітарны стан грамадскіх пакояў. Актыўна вядзецца студсаветам падрыхтоўка да святкавання 30-годдзя Перамогі над фашысцкай Германіяй.

Але, разам з тым, партсход адзначыў рад недахопаў у рабоце студсавета. Зацягваецца афармленне пакоя баявой славы да 30-годдзя Перамогі над фашысцкай Германіяй, маюцца выпадкі парушэння правіл унутранага распарадку.

Сур'ёзным недахопам у рабоце з'яўляецца адсутнасць у інтэрнаце памяшканняў для масавых мерапрыемстваў. Няма памяшкання і для самастойнай работы студэнтаў, таму ленінскі пакой часта выкарыстоўваецца як чытальная зала. У інтэрнаце мала душавых пакояў, не ўсюды ёсць водаправодныя краны.

Партыйны сход пастанавіў лічыць асноўнай задачай адміністрацыйных і грамадскіх арганізацый інтэрната № 6 паляпшэнне бытавых умоў студэнтаў, узмацненне палітыка-выхаваўчай, культурна-масавай і ваенна-патрыятычнай работы сярод іх.

Неабходна актыўней прыцягваць выкладчыкаў факультэта і грамадскіх кафедр для чытання лекцый і правядзення гутарак са студэнтамі ў інтэрнаце, а таксама для афармлення ленінскага пакоя.

Партбюро, дэканату і прафбюро факультэта даручана звярнуцца ў рэктарат і адміністрацыйна-гаспадарчую частку універсітэта з хадайніцтвам аб абсталяванні ў інтэрнаце памяшкання для масавых мерапрыемстваў, аб перабудове душавых пакояў, наладжванні ацяпляльнай сістэмы.

А. БАРЫСЕНКА.

## ПРАНЕСЦІ ПА ЮНАЦТВУ З ГОНАРАМ

Прыступіла да абмену камсамольскіх дакументаў адна з вядучых камсамольскіх арганізацый універсітэта — камсамольская арганізацыя факультэта журналістыкі.

Першымі гэтага гонару ўдастоіліся лепшыя студэнты IV курса.

Сакратар камітэта камсамола БДУ У. А. Навумовіч напомніў асноўныя вехі гераічнага шляху ленінскай камсамоліі, гісторыю камсамольскага білета.

Слова ветэранам партыі і камсамола, выкладчыкам факультэта —

**Р. В. Булацкі,** дэкан:

— Наша пакаленне з камсамольскім білетам ля сэрца прайшло вайну, у баях змяніла яго на партбілет. Жадаю і вам пранесці гэты дакумент па свайму юнацтву з гонарам.

**М. Я. Цікоцкі,** член парткома універсітэта:

— Перш за ўсё не забывайце, што вы журналісты і павінны заўсёды знаходзіцца на перадавой...

**Б. В. Стральцоў,** сакратар партбюро факультэта:

— Кожны камсамолец павінен адчуваць адказнасць — ён носіць у кішэні дакумент з профілем Ільіча на вокладцы.

У заключэнне выступіла чацвёртакурсніца, дэлегат XVI з'езда ВЛКСМ Зоя Гаўрышчук. Яна запэўніла старэйшых таварышаў, што сённяшняя моладзь будзе дастойным прадаўжальнікам слаўных спраў папярэдніх пакаленняў камсамоліі.

Фота **А. Цыгулёва.**





## НАВІНЫ

**З першага красавіка студэнты і супрацоўнікі амаль усіх факультэтаў універсітэта ўключыліся ў правядзенне камуністычнага суботніка. Яны працуюць у сваіх інтэрнатах, на ўборцы тэрыторыі універсітэцкага гарадка, у трэсце зялёнай гаспадаркі і ў дарожна - эксплуатацыйным упраўленні Кастрычніцкага раёна горада Мінска.**

***

**На ФПМ члены СНТ выпусцілі насценную фотагазету, якая расказвае аб студэнцкіх навуковых гуртках, што працуюць на факультэце. Мэта яе — прыцягненне да работы ў гуртках студэнтаў малодшых курсаў.**

***

**7 красавіка пачалася XXXII студэнцкая навуковая канферэнцыя, у якой прымуць удзел члены СНТ усіх факультэтаў.**

***

**Студэнты і супрацоўнікі фізічнага факультэта рыхтуюцца да правядзення «Дзён фізіка», якія пачнуцца праз два тыдні.**

***

**Некалькі лекцый па тэорыі і практыцы журналістыкі прачытаў студэнтам III курса журфака былы спецыяльны карэспандэнт вядучых рэспубліканскіх газет М. М. Качавы.**

***

**Не так ужо і многа часу засталося да пачатку трэцяга, працоўнага семестра, падрыхтоўка да якога ідзе ў БДУ поўным ходам.**

**Байцы студэнцкіх будаўнічых атрадаў у гэтыя дні здаюць экзамены па тэхніцы бяспекі і праходзяць медагляд.**

## НАМ ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ

**На філфаку прайшоў месячнік славы, прысвечаны 30-годдзю Перамогі над нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Адпаведна з планам быў праведзены агляд мастацкай самадзейнасці, арганізаваны грамадска-палітычныя чытанні, сустрэчы з выкладчыкамі — удзельнікамі Вялікай Айчыннай вайны.**

**Ю. КАРАЛЕЦКАЯ.**

***

**На падрыхтоўчым аддзяленні адбылася цікавая сустрэча з былым ветэранам Вялікай Айчыннай вайны, падпалкоўнікам медыцынскай службы, заслужаным урачом рэспублікі Яўгеніяй Яфстафаўнай Сярковай, якая расказала многа цікавага і незабыўнага аб цяжкіх і гераічных днях вайны.**

**Н. АЎРАМАВА, Н. ЗАЙМІСТ.**

***

**Агітбрыгада гістарычнага факультэта выступіла з канцэртам перад жыхарамі вёскі Засулле Стаўбцоўскага раёна. Бурнымі апладысментамі было сустрэта паяўленне нашых артыстаў на сцэне сельскага клуба. Вяла канцэртную праграму студэнтка II курса Ала Мурына.**

**К. ДЫЛЬКО.**

Народны кантроль

# СТАРОНКА № 9

# ПРЫНЦЫП ГАЛОСНАСЦІ

*Органы народнага кантролю, запісана ў «Палажэнні аб органах народнага кантролю ў СССР», займаюць важнае месца ў савецкім грамадстве як адна з форм народнай дэмакратыі. Праз іх шырокія масы працоўных здзяйсняюць права кантролю ў галіне эканомікі, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва, актыўна ўдзельнічаюць у кіраванні справамі дзяржавы і грамадства.*

*Адным з важнейшых прынцыпаў, сфармуляваных У. І. Леніным, які пакладзены ў аснову паўсядзённай дзейнасці органаў народнага кантролю, з'яўляецца прынцып галоснасці.*

*Укараненне галоснасці ў работу ўсіх ГНК, якія існуюць ва універсітэце, — важная задача, што павінна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі груп. Ад рашэння гэтай задачы ў значнай ступені залежаць нашы далейшыя поспехі ў здзяйсненні народнага кантролю.*

*На адным з апошніх пасяджэнняў ГНК БДУ было разгледжана пытанне аб стане галоснасці ў рабоце. Было адзначана, што добра абстаяць справы па гэтаму пытанню ў ГНК журфака, хімфака, біяфака. На гэтых факультэтах абсталяваны стэнды, на якіх рэгулярна змяшчаецца інфармацыя аб усіх мерапрыемствах, якія праводзяцца народнымі кантралёрамі.*

*Але ў асобных групах народнага кантролю пытанням галоснасці не надаецца вялікай увагі. Крытыцы былі падвергнуты ГНК юрфака, матфака і філфака.*

*Факультэцкія ГНК слаба выкарыстоўваюць у сваёй рабоце такую магчымасць для развіцця галоснасці, як публікаванне сваіх матэрыялаў у шматтыражцы БДУ. Яшчэ рэдка выступаюць народныя кантралёры з матэрыяламі праверак на партыйных, прафсаюзных і камсамольскіх сходах, на пасяджэннях саветаў факультэтаў і кафедр.*

*З мэтай абмену вопытам і актывізацыі работы ГНК з 15 па 30 мая будзе праведзены 4-ы агляд сродкаў галоснасці.*

*Універсітэцкая ГНК заклікае ўсе групы прыняць самы актыўны ўдзел у аглядзе.*

*Я. ТАГУНОЎ,*
*старшыня ГНК БДУ.*

# КЛОПАТЫ Ў НАС АГУЛЬНЫЯ

— Нашы далейшыя поспехі будуць новым укладам у выкананне гістарычных рашэнняў XXIV з'езда КПСС,— такімі словамі старшыня ГНК С. В. Говін адкрыў першае ў новым семестры пасяджэнне групы народнага кантролю факультэта журналістыкі.

У сваёй справаздачы прамоўца адзначыў, што ГНК факультэта ў 1974 годзе кіравалася ў сваёй рабоце рашэннямі і пастановамі партыі і ўрада. На справаздачна - выбарнай канферэнцыі, якая адбылася ў канцы 1973 года, народныя кантралёры атрымалі наказ звярнуць асаблівую ўвагу на пытанні арганізацыйна-масавай работы. З таго часу гэты наказ стаў практычным кіраўніцтвам пры складанні планаў работы.

ГНК факультэта значную ўвагу ўдзяляе кантролю за навуковай арганізацыяй вучэбнага працэсу і яго планаваннем. У прыватнасці, было ўказана на выпадкі нераўнамернага планавання вучэбных нагрузак асобных выкладчыкаў. Кафедры своечасова ўлічылі гэтыя заўвагі і ўхілілі недахопы.

Члены ГНК пастаянна сачылі за вучэбнай дысцыплінай студэнтаў і асабліва за вучэбна-выхаваўчым працэсам на вячэрнім і завочным аддзяленнях, за мерамі спагнання, што прымяняе дэканат да парушальнікаў вучэбнай дысцыпліны.

Народныя кантралёры пільна правяралі, як беражліва і рацыянальна расходуюцца грашовыя і матэрыяльныя сродкі на факультэце. Парадак назначэння стыпендый — абавязковы пункт праверак у плане мерапрыемстваў ГНК.

**Асаблівая ўвага была скіравана на інтэрнат студэнтаў-журналістаў. У працэсе праверак-рэйдаў былі выяўлены значныя недахопы ў бытавым абслугоўванні жыхароў інтэрната. Дзякуючы намаганням ГНК вымушаны былі пакінуць інтэрнат студэнты іншых факультэтаў, якія жылі тут без усякай падставы. Быў прадоўжаны рабочы дзень буфета. Але пытанне аб харчаванні студэнтаў як у інтэрнаце, так і на факультэце вымушае чакаць лепшага і патрабуе неадкладных арганізацыйных мерапрыемстваў гаспадарнікаў БДУ.**

Прысутныя горача падтрымалі старшыню ГНК факультэта С. В. Говіна ў тым, што і надалей інтэрнат № 3 будзе знаходзіцца ў полі зроку народных кантралёраў факультэта журналістыкі.

Групай народнага кантролю ажыццяўляўся таксама кантроль за матэрыяльна-тэхнічным забеспячэннем вучэбнага працэсу, у прыватнасці за работай кабінетаў у час падрыхтоўкі да летняй сесіі, за кіраваннем кафедр дыпломнымі работамі студэнтаў.

**Па выніках праверак уносіліся канкрэтныя рэкамендацыі, накіраваныя на ўхіленне недахопаў. Ход праверак шырока абмяркоўваўся ў насценным друку, на партыйных і прафсаюзных сходах. Стала добрай традыцыяй, што ўдзел у праверках ГНК прымае і «Камсамольскі пражэктар» факультэта. Група народнага кантролю ў далейшым павінна шырэй прыцягваць да грамадскай дзейнасці новых членаў калектыву. У першую чаргу рэйдавыя брыгады павінны ўключаць членаў партбюро і прафбюро. Кантакт з партыйнай, камсамольскай, прафсаюзнай арганізацыямі карысны тым, што тое ці іншае пытанне становіцца клопатам агульным, а не пэўных членаў ГНК. З другога боку, народным кантралёрам факультэта трэба быць больш настойлівымі ў барацьбе за дзейснасць праверак і кантраляваць выпраўленне выяўленых хібаў.**

На сваім пасяджэнні члены ГНК аднагалосна прыйшлі да вываду, што на факультэце склаўся дружны калектыў народных кантралёраў. Прыклад у рабоце падаюць выкладчык В. М. Шэін, студэнты М. Беразайтэс, І. Лаўрынавічус і іншыя. Было адзначана, што найбольш эфектыўным метадам работы з'яўляецца такі, які дае магчымасць не проста канстатаваць факты, а своечасова прадухіліць адмоўныя з'явы.

Улічваючы вопыт мінулага года, а таксама выяўленыя недахопы ў арганізацыі, група народнага кантролю факультэта журналістыкі распрацавала новы план на бягучы год, першыя пункты якога ўжо выконваюцца.

**Г. МАРОЗАЎ,**
**член ГНК журфака.**



**Члены сектара вучэбнай работы групы народнага кантролю універсітэта В. І. Шабанава, Л. Р. Кірыла, І. І. Цюніс, М. А. Каваленка абмяркоўваюць бягучыя справы.**
**Фота М. НЕЧЫПАРЭНКІ.**

# *ВЕЛЬМІ ПАТРЭБНЫ ДАПАМОЖНІК*

У апошні час значна ўзрасла роля навучання, заснаванага на самастойнасці навучэнца. Гэта растлумачваецца тым, што дасягнуць якаснага ўздыму ў падрыхтоўцы высокакваліфікаваных спецыялістаў можна сумеснымі намаганнямі педагога і студэнта. Таму ў працэсе навучання неабходна даваць студэнтам не толькі пэўны аб'ём ведаў, але, што самае галоўнае, навучыць іх творча карыстацца імі.

Прывіваць студэнтам самастойнасць мыслення і крытычнае ўспрыняцце вывучаемага матэрыялу патрэбна з першых дзён вучобы. Асабліва важнае значэнне для павышэння эфектыўнасці вучэбнага працэсу і паспяховасці мае актывізацыя самастойнай работы студэнтаў І—ІІ курсаў. Улічваючы гэта, рэктаратам універсітэта ў плане работы са студэнтамі гэтых курсаў на 1973—1974 і 1974—1975 навучальныя гады прадугледжана распрацаваць на ўсіх факультэтах дапаможнікі для самастойнай работы. Яны павінны ўтрымліваць вучэбныя праграмы вывучаемых дысцыплін з прыкладаннем вучэбнага плана на ўвесь перыяд навучання, план вучэбных заняткаў, графік абавязковых заданняў, метадычныя ўказанні па вывучэнню найбольш складаных дысцыплін і ўказальнік літаратуры па кожнай тэме.

Маючы такі дапаможнік, студэнт пастараецца самастойна заглянуць у тую частку курса, якая яшчэ не чыталася на лекцыі. Слухаць лекцыю ён будзе ўжо не пасіўна, толькі паспяваючы запісваць пачутае, а актыўна, творча, крытычна ўспрымаючы новы матэрыял, задаючы пры гэтым рад пытанняў.

Што ж зроблена на факультэтах нашага універсітэта, каб забяспечыць студэнтаў неабходнымі для іх дапаможнікамі?

Работа па падрыхтоўцы дапаможнікаў для самастойнай работы вядзецца, але, на жаль, да гэтага часу яшчэ недастаткова інтэнсіўна і не на ўсіх факультэтах.

Такія дапаможнікі падрыхтаваны толькі на юрыдычным факультэце і факультэце журналістыкі. Аднак падрыхтаваныя дапаможнікі маюць рад недахопаў. Так, у дапаможніку, падрыхтаваным на факультэце журналістыкі, не названа літаратура па кожнай тэме вывучаемага курса, што перашкаджае самастойнай рабоце студэнта.

Каб дапаможнікі былі выпушчаны як мага хутчэй на ўсіх факультэтах, патрэбна распрацаваць адзіныя для ўсіх факультэтаў рэкамендацыі па падрыхтоўцы метадычнага дапаможніка для самастойнай работы студэнтаў І і ІІ курсаў, дзе павінна быць указана, з якіх раздзелаў ён складаецца, іх змест, аб'ём і інш. Значную дапамогу ў гэтым пытанні мог бы аказаць вучэбна - метадычны кабінет універсітэта.

Неабходна ўзмацніць кантроль за выкананнем рашэння рэктарата аб падрыхтоўцы дапаможнікаў для самастойнай работы студэнтаў, бо на некаторых факультэтах гэтая работа, па сутнасці, яшчэ не пачата.

І апошняе. Падрыхтаваныя дапаможнікі трэба тэрмінова друкаваць і раздаваць студэнтам, а, можа быць, прадаваць іх у кніжным кіёску універсітэта. Пажадана, каб такія дапаможнікі былі падрыхтаваны і выдадзены да новага навучальнага года.

**Л. КІРЫЛА,**
**М. КАВАЛЕНКА,**
**В. СІНІЦА,**
**члены сектара вучэбнай работы ГНК універсітэта.**

# ПА ВЫНІКАХ ПРАВЕРКІ

Група народнага кантролю біялагічнага факультэта праверыла вучэбна-метадычную работу кафедр за 1973—1974 навучальны год. Заслухаўшы і абмеркаваўшы паведамленні Т. І. Запольскай, Н. А. Лямезы, А. І. Сцефановіча і Е. І. Тарасевіч па гэтаму пытанню, група народнага кантролю адзначыла, што прафесарска-выкладчыцкім саставам праводзіцца значная вучэбна-метадычная работа: распрацоўваюцца новыя спецкурсы, перапрацоўваюцца і дапаўняюцца агульныя курсы і спецкурсы, якія кожны год чытаюцца на факультэце. Распрацоўваюцца вучэбныя і рабочыя планы, курсавыя і дыпломныя заданні. Складаюцца метадычныя распрацоўкі па вялікаму і малому практыкумах, каляндарныя планы лекцый і практычных заняткаў. Абнаўляецца і папаўняецца таблічны і раздатачны матэрыял, прыгатаўляюцца слайды.

Выкладчыкі працуюць над мадэрнізацыяй работ па вялікаму і малому спецпрактыкумах, над складаннем экзаменацыйных білетаў. Праводзіцца пэўная работа па напісанню вучэбна-метадычных дапаможнікаў і распрацовак, канспектаў лекцый.

Практыкуецца наведванне лекцыйных і лабараторных заняткаў загадчыкамі кафедр, узаеманаведванне лекцый і лабараторных заняткаў выкладчыкамі. На ўсіх кафедрах вядзецца журнал наведвання і ўзаеманаведвання заняткаў выкладчыкамі, у якіх запісваюцца заўвагі і прапановы, даецца ацэнка заняткаў.

Пытанні вучэбна-метадычнай работы на стацыянары, вячэрнім і завочным аддзяленнях абмяркоўваюцца на пасяджэннях кафедр.

Прафесарска - выкладчыцкі састаў факультэта прымае ўдзел у навукова-метадычных канферэнцыях, семінарах.

Аднак група народнага кантролю выявіла і некаторыя недахопы. На пасяджэннях кафедр рэдка абмяркоўваюцца справаздачы выкладчыкаў аб выкананні запланаваных імі мерапрыемстваў па вучэбна-метадычнай рабоце. Выяўлены выпадкі, калі асобныя выкладчыкі ўключалі ў свае індывідуальныя планы такія пытанні, якія не прадугледжаны рэкамендацыямі. Напрыклад, «дапрацоўка» спецкурса, наведванне лекцый іншых выкладчыкаў. Запланаваныя мерапрыемствы не заўсёды канкрэтныя. Напрыклад, плануецца распрацоўка новых лабараторных работ, напісанне новых вучэбных дапаможнікаў, аднак не ўказваецца курс, форма навучання, для якіх гэтыя работы ці дапаможнікі рыхтуюцца. Не ўсе метадычныя дапаможнікі, распрацоўкі, тэксты лекцый, табліцы, калекцыі і г. д. датаваны, у сувязі з чым цяжка ўстанавіць, наколькі яны абноўлены.

Па выніках праверкі група народнага кантролю біялагічнага факультэта выпрацавала пастанову, у якой загадчыкам кафедр рэкамендавана разглядаць і зацвярджаць справаздачы выкладчыкаў аб выданні вучэбна-метадычнай работы на паседжаннях кафедр. Кафедрам факультэта прапанавана больш увагі ўдзяляць падрыхтоўцы вучэбна-метадычных дапаможнікаў, канспектаў лекцый, якія асабліва патрэбны студэнтам-завочнікам і вячэрнікам. Дэканату, загадчыкам кафедр неабходна ажыццяўляць строгі кантроль за выкананнем вучэбна - метадычнай работы кожнага выкладчыка.

**А. СЦЕФАНОВІЧ,**
**старшыня ГНК біяфака.**

ДА 30-ГОДДЗЯ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ

# СТАРОНКІ СЛАВЫ БАЯВОЙ

## МІНСК — ГОРАД-ГЕРОЙ



**Раздзел «Старонкі славы баявой» вядзе в. а. дацэнта кафедры гісторыі СССР гістарычнага факультэта Л. А. Міхайлоўскі.**

**(Працяг. Пачатак у №№ 32, 35 за 1974 г. і ў №№ 3, 5, 9 за 1975 г.).**

У лютым 1943 года ў Маскве адбыўся V пленум ЦК КП(б)Б, які паставіў перад падпольнымі арганізацыямі і партызанскімі атрадамі задачу, якая вынікала са змянення абстаноўкі на фронце. Ва ўмовах пераможнага наступлення Чырвонай Арміі і адступлення нямецка - фашысцкіх войск неабходна шырэй разгарнуць работу па мабілізацыі працоўных Беларусі на барацьбу ў тыле ворага, узмацніць удары партызан па камунікацыях праціўніка. Кіруючыся рашэннямі V пленума ЦК КП(б)Б, Мінскі падпольны абком партыі накіраваў сваю дзейнасць на ўзмацненне кіруючай ролі партыйных арганізацый у партызанскім руху, масава-палітычнай работы, на далейшае расшырэнне партызанскай барацьбы, уцягненне ў яе новых слаёў насельніцтва, на арганізацыйнае ўмацаванне і павышэнне актыўнасці партызанскіх атрадаў. Баявая дзейнасць партызан накіроўвалася на разбурэнне камунікацый праціўніка, знішчэнне яго жывой сілы і тэхнікі, на выратаванне насельніцтва ад знішчэння і ўгону ў рабства.

У кастрычніку 1943 года па ўказанню ЦК Кампартыі Беларусі Мінскім падпольным абкомам КП(б)Б быў створаны Мінскі падпольны гарком партыі, які базіраваўся ў лагеры партызанскага спецатрада Градава. У састаў гаркома ўвайшлі С. Ляшчэня (Савельеў) — сакратар ГК; Г. Машкоў— сакратар ГК па прапагандзе; С. Ваупшасаў (Градаў) і І. Родзін— члены камітэта.

Адной з галоўных задач гаркома партыі было стварэнне падпольных груп на прадпрыемствах і ва ўстановах Мінска.

Былі створаны спецыяльныя групы, якія назіралі за мініраваннем памяшканняў. Дзякуючы гэтаму пры адступленні фашыстаў удалося выратаваць такія буйныя будынкі, як Дом урада, будынак ЦК КП(б)Б і акруговы Дом афіцэраў.

Вялікую ролю ў арганізацыі шырокіх народных мас акупіраванай тэрыторыі на барацьбу супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў сыграў партыйны друк, пра які У. І. Ленін сказаў, што ён можа стаць «часцінкай вялізнага кузнечнага меха, які раздувае кожную іскру класавай барацьбы і народнага абурэння ў агульны пажар».

Важнай падзеяй у жыцці гарадскога падполля было стварэнне падпольнай газеты «Звязда». Першы нумар яе быў набраны ў маі 1942 года. Газету набралі наборшчыкі друкарні Свірыд і Пупко. Друкаваўся гэты нумар на кватэры Воранавых па Шорнай вуліцы, 9. Рэдактарам першага нумара «Звязды» быў У. Амельянюк. Актыўны ўдзел у выпуску газеты прымалі В. Сайчык, бацька і сын Воранавы і іншыя.

Работа падпольнай друкарні не спынілася і пасля зладзейскага забойства фашыстамі У. Амельянюка, сям'і Воранавых і іншых работнікаў друкарні. У чэрвені 1942 года першы нумар «Звязды» быў перавыдадзены дадатковым тыражом. Па рашэнню гарадскога партыйнага цэнтра выхадам у свет газеты і лістовак займаўся В. Нікіфараў, рэдактарам газеты была Ядзвіга Савіцкая. Адказным за выданне гэтых нумароў газеты ў падпольнай друкарні быў В. Казачонак, наборшчыкам — А. Александровіч, друкавалі газету Благаразумаў і Рынкевіч.

Ва ўмовах жорсткага тэрору героі Мінска наладзілі выданне газеты, кожны радок якой заклікаў беларускі народ да бязлітаснай барацьбы з фашыстамі, усяляў у сэрцы савецкіх людзей, што апынуліся на акупіраванай тэрыторыі, мужнасць і ўпэўненасць у перамозе!

Газета праўдзіва расказвала аб цяжкасцях вайны, аб становішчы на франтах, аб стойкасці і вытрымцы савецкіх людзей.

Каб не быць выследжанай шпіёнамі і правакатарамі, рэдакцыя газеты «Звязда» вымушана была часта мяняць месца сваёй работы. Са студзеня 1943 года газета па рашэнню ЦК КП(б)Б стала выходзіць рэгулярна ў распалажэнні партызан Мінскага злучэння.

У друкарні мінскага падполля друкаваліся таксама і лістоўкі. Змест падпольных лістовак таксама, як і газет, быў разнастайны, грунтаваўся на канкрэтных фактах, узятых з жывой рэчаіснасці. Лістоўкі звалі савецкіх патрыётаў на барацьбу з нямецка - фашысцкімі захопнікамі, выхоўвалі нязломную волю: «Толькі ў барацьбе вы заваюеце сабе права на жыццё і свабоду, а пасля перамогі вы смела і горда зможаце сказаць: «Радзіма, я набыў у барацьбе права быць тваім грамадзянінам!» Да зброі, таварышы!».

# ПРАБЛЕМЫ І ЗАДАЧЫ МЕТАДЫЧНАЙ ПРАЦЫ

На факультэце журналістыкі надаецца вялікае значэнне метадычнай рабоце. На кожным курсе працуюць метадычныя камісіі, у якія ўваходзяць вядучыя выкладчыкі факультэта. Праца камісій абумоўлена спецыфікай журналісцкага навучання, дзе разам з засваеннем агульнаадукацыйных, спецыяльных дысцыплін студэнты першага курса праходзяць практыку ў рэдакцыях газет, на радыё і тэлебачанні. Роля камісіі асабліва ўзрасла пасля пастаноў ЦК КПСС і ЦК КПБ аб падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы журналісцкіх кадраў і аб ролі газет, часопісаў, радыё і тэлебачання ў выкананні рашэнняў XXIV з'езда КПСС. У гэтых дакументах прадугледжаны меры па больш глыбокаму засваенню студэнтамі факультэтаў журналістыкі тэорыі і практыкі адлюстравання і вырашэння сродкамі масавай інфармацыі праблем эканамічнага, гаспадарчага і культурнага развіцця. Зыходзячы з гэтага, метадычная камісія факультэта журналістыкі, а таксама метадычныя камісіі кожнага курса і будуюць сваю работу.

**Асабліва адказная задача ў камісіі першага курса. Калі старт атрымліваецца своечасовы і моцны, можна разлічваць на добры вынік на працягу ўсёй вучобы. Таму канкрэтная праца метадычнай камісіі на першым курсе пачынаецца з першага дня вучобы студэнтаў.**

**Разам з партыйнай, камсамольскай арганізацыямі і дэканатам метадычная камісія прымае ўдзел у «сустрэчных» мерапрыемствах першакурснікаў. Вельмі важна хутка прызвычаіць першакурснікаў да універсітэцкага жыцця, дапамагчы ім пераадолець разгубленасць і нават, страх перад «падарожжам у навуку».**

Метадычная камісія першага курса факультэта журналістыкі, акрамя чыста азнаямленчых мэт, мае на ўвазе ў гэтых мерапрыемствах яшчэ адну канкрэтную мэту — накіраваць усе сілы першакурснікаў на ўпартую працу ў аўдыторыі з першага дня, пазбегнуць зацягвання расслабленасці пасля ўступных экзаменаў, «удыхнуць» упэўненасць у тым, што абавязковы поспех прыйдзе толькі пры ўмове штодзённых сістэматычных заняткаў.

Але гэта ўсё ж не асноўная наша задача. Галоўная работа перакладваецца на вучэбныя будні, калі першакурснік у няўмольна строгіх рамках вучэбнага працэсу можа разгубіцца, а потым безнадзейна адстаць ад сваіх таварышаў. Каб гэтага не здарылася, мы падрыхтавалі на факультэце для першакурснікаў графік вучэбнага працэсу. Студэнт ужо на гэтай падставе можа размеркаваць свой час, узважыць свае магчымасці, адчуць логіку самога вучэбнага працэсу.

**Графік вучэбнага працэсу быў першым крокам у сістэме метадычнай работы. Яго працягам з'яўляюцца метадычныя распрацоўкі па кожнай дысцыпліне, сабраныя ў адной брашуры, дзе, акрамя тэматыкі, ёсць і поўная бібліяграфія да яе. Брашура з'яўляецца кароткім, але даволі поўным даведнікам у асэнсаванні кожнага курса. Студэнт наглядна можа ўявіць аб'ём працы па кожнай дысцыпліне і весці падрыхтоўку ў залежнасці ад сваіх магчымасцей у любы час: канспектаваць першакрыніцы, загадзя знайсці неабходныя кнігі, манаграфіі, брашуры, артыкулы. Гэты метадычны дапаможнік і разлічаны на тое, каб студэнт падрыхтаваў сябе не толькі да пасіўнага ўспрымання матэрыялу па курсу, але і сам актыўна працаваў па больш глыбокаму яго засваенню.**

Тут адразу ж паўстала пытанне кантролю за самападрыхтоўкай кожнага студэнта. На пачатку гэта справа складаная. Увесь кантроль ажыццяўляўся толькі выкладчыкамі, іншы раз — куратарамі груп. Цяпер мяркуецца даручыць кантроль за самападрыхтоўкай метадычнай камісіі, а потым і пэўным кафедрам па асобных дысцыплінах.

Зразумела, што ў першую чаргу ў поле зроку камісіі трапляюць тыя студэнты, якія адстаюць у вучобе, слабей рыхтуюцца да практычных заняткаў і ў той жа час менш заняты на практыцы ў газетах, на радыё і тэлебачанні і нават менш удзельнічаюць у грамадскім жыцці. Камісія павінна не толькі вызначыць і вывучыць прычыны адставання студэнта, але і пэўным чынам дапамагчы яму разабрацца ў гэтых прычынах, знайсці правільнае выйсце. У кафедр такія ж задачы, але ўжо на больш высокім узроўні.

Ужо шмат зроблена, факультэт журналістыкі па выніках зімовай сесіі—на другім месцы па паспяховасці ва універсітэце, але ўсё ж праблем у працы метадычных камісій стала не менш. Яшчэ вельмі шмат нявыкарыстаных рэзерваў. Гэта паказала і агульнауніверсітэцкая канферэнцыя па праблемах метадычнай працы.

Кожны факультэт шукае і знаходзіць штосьці новае, а ўрэшце «варыцца ў сваім саку». Шмат літаратуры выходзіць па праблемах метадычнай працы, але не часта вопыт іншых можна выкарыстаць. Трэба, каб старшыні факультэцкіх камісій пабывалі на факультэтах іншых універсітэтаў, або можна было б запрасіць калег да сябе. Час ад часу неабходна праводзіць інструктыўна - метадычныя заняткі старшынь курсавых метадычных камісій і асабліва першых курсаў, дзе, нягледзячы на нашы старанні, яшчэ нізкі працэнт паспяховасці. Урэшце, больш друкаваць матэрыялаў па метадычнай працы ў «Весніку БДУ».

Кожнае наша намаганне ў гэтым кірунку будзе садзейнічаць паляпшэнню падрыхтоўкі высокакваліфікаваных спецыялістаў для народнай гаспадаркі.

**А. СЛУКА,**
**старшыня метадычнай камісіі I курса факультэта журналістыкі.**





**Заняткі па англійскай мове са студэнтамі 1 курса гістфака ў лінгафонным кабінеце праводзіць Тамара Віктараўна Елісеева.**

**Фота Д. ПРЭСА.**

# ШЛЯХ ДА ДЫПЛОМА

**Пройдзе зусім нямнога часу, і пяцікурснікі стануць самастойнымі спецыялістамі. А пакуль што аб падрыхтоўцы да абароны дыпломных работ мы папрасілі расказаць загадчыка кафедры рускай літаратуры філалагічнага факультэта Любоў Іванаўну ФІГЛОЎСКУЮ.**

— Гэтай вясной на нашай кафедры дыпломныя работы абараняюць 77 выпускнікоў: 37 студэнтаў стацыянара, 34 завочнікі і 6 вячэрнікаў. Сярод іх — студэнты, якіх мы ведаем як людзей здольных, упартых, эрудзіраваных. А. Савіцкая, Н. Жэчка, Г. Лабацэвіч, В. Сакалова і іншыя былі актыўнымі ўдзельнікамі гурткоў кафедры — рускай савецкай літаратуры і вуснай народнай творчасці. Яны не раз выступалі з навуковымі паведамленнямі на факультэцкіх канферэнцыях. Усяго на апошні рэспубліканскі агляд студэнцкіх навуковых работ кафедрай было накіравана 15 даследаванняў, 5 работ удастоены дыплома I катэгорыі.

Праграма стацыянара разлічана так, што над тэмай дыпломнай студэнты могуць працаваць тры гады, пачынаючы з курсавой работы на III курсе. Чацвёртакурснікі пішуць на семінары навуковую работу, якая абараняецца як курсавая. Такім чынам, атрымліваецца ланцуг: курсавая — семінарская — дыпломная. Напрыклад, Валянціна Прылуцкая на IV курсе рабіла даклад «Мастацкая задума і яе ўвасабленне ў рамане М. Шолахава «Паднятая цаліна». Гэтая ж тэма, крыху расшыраная, лягла ў аснову дыпломнай.

Няўхільна назірае кафедра і за вячэрнікамі, завочнікамі. Студэнты запрашаюцца на пасяджэнні кафедры, дзе заслухоўваюцца інфармацыі дыпломнікаў і іх кіраўнікоў аб ходзе работы над дыпломнымі, даюцца кансультацыі. А. Латушкіна ў дыпломнай «Вясельная паэзія» выкарыстала запісы народных песень, зробленыя ёю на Мядзельшчыне. Навуковае значэнне мае і работа А. Пархімчук. У яе аснове —фальклор Брэсцкай вобласці. Кафедра клапоціцца аб тым, каб такія работы атрымалі выхад у друк — былі змешчаны ў зборніках «Беларускі фальклор у сучасных запісах».

Яшчэ адзін цікавы аспект — тэматыка дыпломных работ. У параўнанні з мінулымі гадамі на першы план вылучалася ваенна - патрыятычная тэма. Яна і раней была адной з галоўных, але цяпер у сувязі з 30-годдзем Перамогі савецкага народа над нямецка - фашысцкімі захопнікамі набыла большае гучанне. Студэнты аналізуюць творчасць К. Сіманава, Б. Васільева, А. Чакоўскага і іншых пісьменнікаў. Павялічылася колькасць работ па творчасці М. Шолахава ў сувязі з яго 70-годдзем. Многа работ па ленінскай тэматыцы.

Адметная рыса — тэмы па літаратурна - мастацкай крытыцы, яе гісторыі, напрамках развіцця. Або такая вось цікавая, незвычайная тэма — «Праблемы НТР і шляхі іх мастацкага вырашэння ў сучаснай аповесці».

Але не толькі выбар актуальнай тэмы характарызуе сённяшняга дыпломніка. У яго ёсць імкненне аналізаваць канкрэтныя творы ў сувязі з пэўнай тэарэтычнай праблемай, ёсць цяга да сучаснай літаратуры, літаратуры апошняга дзесяцігоддзя. Пяцікурсніца Д. Пільч, напрыклад, піша работу па «Блакадзе» А. Чакоўскага, па свежых слядах, калі можна так сказаць. Тое ж мы бачым у работах па творчасці Б. Васільева, Г. Бакланава. У даследаваннях такога тыпу закранаюцца і пытанні экранізацыі твораў. Студэнтам даводзіцца праяўляць максімум самастойнасці ў рабоце, таму што крытычнай літаратуры па новых кнігах яшчэ мала. У такіх выпадках кіраўнік дапамагае студэнту разабрацца ў праблеме, выправіць памылкі. Асаблівая ўвага аддаецца тым работам, якія начарна напісаны, а гэта ўжо зрабілі А. Тарасюк і Н. Карабіцына.

Кафедра рускай савецкай літаратуры робіць усё, каб напісанне і абарона дыпломных работ поўнасцю мабілізавалі магчымасці і здольнасці выпускніка.

**Запісала**
**С. ШЫДЛОЎСКАЯ.**



У цёплай сяброўскай атмасферы прайшла на філфаку сустрэча з ветэранам вайны, вядомым пісьменнікам і выкладчыкам факультэта Іванам Навуменкам. На вечары выступалі многія педагогі, калегі і вучні пісьменніка, якому нядаўна споўнілася 50 год. Свае вершы, прысвечаныя Івану Якаўлевічу, чытаў паэт Алег Лойка, свае думкі аб творах пісьменніка выказала былая падпольшчыца дацэнт Л. Л. Кароткая.

Ветэран вайны, ветэран БДУ Іван Навуменка расказаў пра ваеннае юнацтва, зрабіў невялікія экскурсы ў сваю творчую майстэрню. І не было ў той вечар канца ні апладысментам, ні цёплым словам, ні кветкам.

Фота **А. ЦЫГУЛЁВА.**

# ШЭФЫ ПРЫЙШЛІ!

Добрая традыцыя існуе на юрыдычным факультэце. Нашы студэнты—шэфы навучэнцаў Мінскага гарадскога прафесійнага вучылішча будаўніксў № 50. Будучыя юрысты кожны раз з задавальненнем ідуць на сустрэчу са сваімі падшэфнымі. Яны дапамагаюць навучэнцам у падрыхтоўцы цікавых сустрэч з героямі працы, ветэранамі, ветэранамі ... сустрэч з героямі працы, вечароў адпачынку.

Апошняя чарговая сустрэча шэфаў і падшэфных адбылася зусім нядаўна. Навучэнцам была прачытана змястоўная лекцыя на тэму «Адказнасць падлеткаў за злачынства па савецкаму заканадаўству», якую падрыхтаваў студэнт 3 курса юрфака Г. Дзмітрук. Пасля лекцыі навучэнцы задалі яму шмат пытанняў.

Потым факультэцкая агітбрыгада дала ў вучылішчы канцэрт.

У канцы сустрэчы дырэкцыя вучылішча і камітэт камсамола шчыра падзякавалі сваім шэфам і запрасілі іх на новую сустрэчу.

**В. ХАДЗЬКО,**
**член камітэта камсамола юрыдычнага факультэта.**

# БАБЧЫН

## (ПАЭМА)

Літаратурны конкурс
30 „ПЕРАМОЗЕ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА"

*Гісторыя, цябе мы ўмеем бачыць*
*Там, дзе ў залах тлумна спяць вякі.*
*А на Палессі—*
*вёска*
*з назвай Бабчын*
*І люд у ёй пявучы, гаваркі.*

*Тут вырайна юнацтва лемантуе,*
*Ды дзед старэчы, едучы ў раён,*
*У аўтобусе з кабеты пажартуе:*
*«Які вам бог даў гэтакі разгон?».*

*На кпін ягоны скажуць вельмі строга*
*Нязмоўчныя палескія жанкі,*
*Што й сёння не заворана дарога,*
*Якой у вёску ходзяць прымакі.*

*За жартамі гісторыю ці ўбачыць?..*
*Сціхае жарт, і зноў перада мной*
*Лясная вёска*
*з ціхай назвай Бабчын,*
*Знявечаная жудаснай вайной.*

*Жанчын надзея: «Можа прыйдзе*
*з войска?..»*
*Як многім з іх яна й цяпер баліць!..*
*Гісторыя, ты назву любай вёскі*
*Пацвердзіла, і вас — не раздзяліць.*

*Не выдумка: тут правілі жанчыны!*
*Тут справам іх —спрадвек шырокі шлях!*
*Цягнулі плуг гурбой*
*і гэтак чынна*
*Ступалі па нявораных палях.*

*У вязанкі збіралі ў лесе голле,*
*Пасля да хаты неслі на плячах.*
*Не раз была жаночая тут доля*
*Слязінай у наплаканых вачах.*

*Ці ж мне адняць у памяці магчыма*
*Той страшны дзень, той векапомны час?*
*У тлуме войнаў ты, мая Радзіма,*
*Была падобна Бабчынам не раз.*

*Жаночымі рукамі ты касіла*
*І драла мох для новых сцен з балот.*
*І да магілы брацкае насіла*
*На стрэчу з бацькам сплаканых сірот...*

*Ішлі байцы у полымя атакі,—*
*Паўзлі вайны крывавыя франты.*
*Ішлі байцы...—*
*І падалі пад танкі*
*І рэзалі Асвенцымаў драты.*

*І гордасцю сыноўняю агорне,*
*Калі прыколюць ордэны яны...*
*Іх пальцы скрыжаваліся на горле*
*Апошняй векапомнае вайны.*

*І стала хлебным полем поле бою*
*Ля кожнай вёскі, кожнага сяла!..*
*Была ты, Бабчын, першаю ўдавою,*
*І першаю матуляй нам была.*

*І радасцю сыноўняю агорне,*
*Калі прыколюць ордэны яны...*
*О рукі, і сягоння вы на горле*
*Жахлівай неўмiручае вайны.*

*У сухавеі і ў мароз на БАМе*
*Рудой вагоны жвавыя гружу, —*
*Рабочымі магутнымі рукамі*
*Яе, вайну крывавую, душу!*

*Дрыгвянішчы, што плеснялі вякамі,*
*Зноў нівай хлебаноснай ўскалашу...—*
*Сялянскімі упартымі рукамі*
*Яе, вайну крывавую, душу!*

*Чарую над натхнёнымі радкамі,*
*Паэму міру гнеўную пішу.*
*Пяро сціскаю...*
*й гэтымі рукамі*
*Яе, вайну крывавую, душу!*

*Я з вёскі той, што Бабчынам завецца.*
*Яна на ўскрайку вогненных бароў.*
*І назва роднай вёскі—*
*чалавецтву*
*З мінулых войнаў жудасных таўро.*

*Тут сеюць жыта.*
*З подыхам вясновым*
*Зноў хлебароб страчае сеўны дзень.*
*Тут не жадаюць знаць навалы новай,*
*Як не жадаюць знаць яе нідзе.*

*Тут песні мы не ўсе яшчэ прапелі*
*(Люблю з маленства я іх ці адзін!),*
*Спраўляючы палескія вяселлі,*
*Жадаючы хвалюючых радзін.*

*Я з вёскі той, што Бабчынам завецца.*
*Яна на ўскрайку вогненных бароў.*
*І, можа б, не яна, ты, чалавецтва,*
*Не змыла б войнаў бруднае таўро!..*

*Мікола МЯТЛІЦКІ,*
*студэнт III курса філфака.*

⊙ СПОРТ ⊙ СПОРТ ⊙ СПОРТ

# СПАРТЫЎНАЯ ХРОНІКА

**ШТАНГІСТЫ — ПЕРШЫЯ**

**На рэспубліканскім першынстве сярод ВНУ рэспублікі паспяхова выступіла каманда штангістаў нашага універсітэта. Яна заняла першае месца, апярэдзіўшы моцны калектыў інстытута фізічнай культуры. Рыхтавалі каманду да спаборніцтваў трэнеры А. Саунін і У. Кавалёў.**

**РЫХТУЮЦЦА КРАСМЕНЫ**

**Лепшыя красмены універсітэта рыхтуюцца прыняць удзел у традыцыйнай эстафеце па вуліцах Мінска. Гэта эстафета, у якой прымуць удзел каманды ўсіх прадпрыемстваў і ўстаноў Мінска, прысвечана 105-й гадавіне з дня нараджэння У. І. Леніна.**

**ПЕРШЫНСТВО ГАНДБАЛІСТАЎ**

**Падыходзіць к канцу першынство універсітэта па ручному мячу. Ужо вызначыліся пераможцы спаборніцтваў у падгрупах. У мужчын імі сталі каманды ФПМ і фізфака, у жанчын—ФПМ і гістарычнага факультэта. Яны і будуць спаборнічаць паміж сабой за 1—2 месцы.**

**СПАБОРНІЧАЮЦЬ ФУТБАЛІСТЫ**

**На універсітэцкім стадыёне пачаліся гульні першынства універсітэта па футболу па праграме XXIII агульнауніверсітэцкай круглагадавой спартакіяды. Вынікі сустрэч, што адбыліся: журфак—юрфак — 0:0, геафак—філфак—4:0, хімфак—філфак — 2:0, журфак—матфак — 0:0.**

# ЗНАЧКІСТЫ ЁСЦЬ, АЛЕ...

3378 значкістаў ГПА падрыхтавана ва універсітэце ў 1974 годзе. І хоць паказчык гэты далёка не лепшы сярод ВНУ, але ў параўнанні з лічбамі 1973 года (2135 значкістаў) — рост бачны. Чым ён дасягнуты?

Безумоўна, палепшылася спартыўна - масавая работа на факультэтах і ва універсітэце ў цэлым. Больш увагі сталі ўдзяляць комплексу ГПА кіраўнікі факультэтаў. Амаль на ўсіх факультэтах камісіі па прыёму нормаў ГПА ўзначалілі выкладчыкі, прадстаўнікі дэканатаў. Больш сістэматычнай і накіраванай стала падрыхтоўка студэнтаў да стартаў ГПА. Але ёсць ва ўсім гэтым і адваротны бок.

Ва універсітэце значна зменшылася колькасць студэнтаў, якія займаюцца ў секцыях. Яны былі пераведзены ў групы агульнафізічнай падрыхтоўкі. Гэта, вядома, дазволіла даць дадатковую колькасць падрыхтаваных значкістаў ГПА, але дрэнна адбілася на выступленнях каманды БДУ ў XVII рэспубліканскай спартакіядзе ДСТ «Буравеснік», у якой каманда заняла 5-е месца, тады як у мінулы раз была другой.

Ва універсітэце нямала цяжкасцей па падрыхтоўцы значкістаў ГПА, якія заслугоўваюць самай сур'ёзнай увагі. Галоўная з іх — плаванне. Для многіх не здаўшых нормы ГПА яно стала асноўнай перашкодай.

Сапраўды, мяркуйце самі. Па анкетных даных 80 працэнтаў дзяўчат, якія паступілі ў гэтым навучальным годзе ва універсітэт, не ўмеюць плаваць. Навучыць іх плаваць у кароткі тэрмін — справа цяжкая. Універсітэт не мае для гэтага дастатковых магчымасцей. Тут вельмі паказальны прыклад нашых суседзяў — педагагічнага інстытута. У інстытуце ёсць свой плавальны басейн, у якім студэнты сістэматычна (раз у тыдзень) вучацца плаванню. Таму і працэнт тых, хто не здаў нормы ГПА па плаванню ў педінстытуце, мінімальны.

Адсюль відавочна, што універсітэту патрэбен свой плавальны басейн і не толькі басейн, а цэлы спартыўны комплекс. Ён патрэбен не толькі плыўцам, але і барцам, стралкам, штангістам, прадстаўнікам іншых відаў спорту. Без надзейнай спартыўнай базы пра высокія спартыўныя поспехі можна толькі марыць.

Спортклубу універсітэта неабходна дапамога і падтрымка камсамольскага актыву. А яе пакуль няма. Пра якую дапамогу можа ісці гутарка, калі самі камсамольцы - актывісты не выходзяць на старты ГПА. Ва універсітэце працуюць пяць інструктараў камітэта камсамола, і ні адзін з іх не з'яўляецца значкістам ГПА.

Слаба пастаўлена работа па прыёму нормаў ГПА у выкладчыкаў універсітэта. Толькі адзінкі з іх з'яўляюцца значкістамі ГПА. Не на высокім узроўні і прапаганда комплексу.

Ва універсітэце тысячы значкістаў. Але мы нечакана звярнулі ўвагу на такі факт: амаль ніхто не носіць гэтых значкоў. Аказваецца, старшыні спортбюро факультэтаў не асабліва спяшаюцца ўзяць у праўленні спортклуба пасведчанні і значкі ГПА. Ну, а ўжо пра ўрачыстае і запамінальнае іх уручэнне і гутаркі няма. Таму і ходзяць па універсітэту тысячы «непрызнаных» значкістаў.

Як бачыце, праблем, звязаных з комплексам ГПА, ва універсітэце нямала. І патрабуюць яны самага хуткага вырашэння. Таму што не да твару універсітэту — флагману вышэйшай адукацыі рэспублікі — хадзіць у «сераднячках».

**Спартыўную падборку зрабіў студэнт II курса журфака**
**В. УСЦЮЖАНІН.**





**НА ЗДЫМКАХ: спаборнічаюць валейбалісткі і баскетбалісткі БДУ і Адэскага універсітэта.**

**Фота А. ПІНДРАСА.**

# СУСТРЭЧА СЯБРОЎ

**Ужо традыцыйнымі сталі спартыўныя сустрэчы каманд універсітэтаў двух гарадоў-герояў — Мінска і Адэсы. На гэты раз у госці да мінчан прыехалі жаночая баскетбольная і валейбольная каманды. Кожная з іх правяла па два матчы.**

**Баскетбалісткі БДУ ў абедзвюх сустрэчах упэўнена перамаглі сваіх саперніц (70:28; 56:33). І на валейбольнай пляцоўцы мацнейшымі былі нашы спартсменкі (3:2; 3:0).**

**Пасля спаборніцтваў адбыліся сяброўскія гутаркі, абмен думкамі, вопытам работы. Спартыўная дэлегацыя гасцей пазнаёмілася з жыццём нашага універсітэта, наведала памятныя мясціны Мінска.**

**Наперадзе — сустрэча на адэскай зямлі.**

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2 000 экз. Аб'ём — 1 друк. ар. АТ 00187 Заказ № 612.

В. а. рэдактара А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.